## *Таццяна Сучкова*

**Салодкі сон**

Сніцца мне салодкі сон:
Шакаладны ходзіць слон
Ля рамонкаў з шакаладу,
Па травінках з марвмеладу.
Там цукровыя дубы
І салодкія грыбы.
Бачу сонейка-талерку,
Вось бы зорачку-цукерку
З’есці мне з талеркі той,
Прахыпіць яшчэ з сабой.
Ліст, як пернік там цукровы,
Над кустом ляжыць мядовым.
У лістоце ледзянцовай
Дрэмлюць крэмаыя совы,
Вельмі смачныя буслы
З ружаватай пасліцы.

**Хлопчык-выхваляйчык**

Ярслаў сяьрам хваліўся:
-Я з ваўком аднойсы біўся
-І, вядома, перамог,
Воўк схаваўся за пянёк.
Разышоўся Ярслаў:
Я слана за хобат браў...
Прыляцела злая муха-
Ярслава цап за вуха,
Вой, вой, вой!-
Усклікнуў ён,
Муха – гэта вам не слон.



**Пеўнік**

У пеўніка грабеньчык
Чырвоны, як агеньчык.
Скачуць куры – скок ды скок,
Бачаць пеўніка здалёк.

**Абібок**

Кот вусаты Ціафей
Не пайшоў лавіць мышей.
Цімафей наш – абібок,
Адляжаў ен правы бок.
Мышку абтбок не чуе,
А засмажаных пільнуе
У халадзільніку гусей –
І яму не да мышэй.

**Пчолкі**

Залатыя пчолкі
Паселі на зёлкі,
Над раслінамі спяваюць.
Дружна крыльямі махаюць,
Каця выбегла на ганак:
- Ах, як медам пахне ранак!

**Месяц**

Над пясчаным бродам
Бераг пахне мёдам.
Месяц у оаку нырае,
Быццам рыбка залатая:
Ціха ноччу весяліцца
У сярэбранай вадзіцы.

***//Нябесны знак: Літаратурна-мастацкі альманах. 2001. Вып.1/Рэд. М.Шаўчонак.-Гродна, 2001.-112с.***

**Забіяка**

Верабейка-забіяка
Дзюбай ушчыпнуў сабаку,
На Шнура крычаў:
-Чыў-чыў!
Бойку ранкам учыніў.
Смела біўся ля куста
І застаўся без хваста.

**Яблык на вярбе**

Да вароны на абед
Прыляцеў снягір-сусед.
Села недалёка
І крычыць сарока:
-Гэй, варона, у цябе,
што за яблык на вярбе?

**Сунічная палянка**

Ля рэчкі Ласясянкі
Сунічная палянка:
Там ягады духмяныя,
Ад сонейка румяныя,
Сябрам гаворыць Света:
-Варэннем пахне лета!

**Павучок**

Працавіты павучок
Вяжа сетку-гамачок
І гаворыць барсуку:
-Вось павешу на сук,
як захочуць мушкі спаць.
Будзем з ветрам іх люляць.



**Расінкі**

Серабрытсыя расінкі
Ззялі ранкам на травініках,
І на сонечнай зямлі,
Як жамчужынкі былі.

**Лета**

Лета, лета, вось дык лета!
Карагод духмяных кветак,
І зялёныя бырозы,
І віхлястыя стракозы.
Цёплы бераг, цеплы вецер,
Да ракі пабеглі дзеці,
Так, на Нёмане зялёным,
Сосны быццам парасоны.
Есць ад спёкі дзе схавацца,
Нёман кліча ўсіх купацца!

**Па горадзе Гродна гуляе вясна**

Па горадзе Гродна гуляе вясна
І птушкамі ў парку спявае яна,
І весел лісцем зяленым шуміць,
Па вуліцы хутка тралейбус бяжыць,
А доўгія вусы, як струны звіняць,
І ветрыку нават яго не дагнаць.
У парку вясновым кукуе зязюля,
Каштан на прыпынку ў зялёнай кашулі,
І шэпча бярозка яму: - Навіна,-
Па горадзе Гродна гуляе вясна.

***//Нябесны знак: Літаратурна-мастацкі альманах. 2001. Вып.1/Рэд. М.Шаўчонак.-Гродна, 2001.-112с.***

**Таццяна Сучкова**

### Зіма

Гурба снегу ў садўзе белым,
А на гурбу сонца села.
Снег лятае серабрытсы,
Зіхаціць у полі чыстым,
І сцяжынкі над зямлёй
Скачуць весела гурбой.
Белы вецер пад рабінкай
Сцеле белую пярынку,
Зоркі ў полі рассыпае...
Па сцяжынках хто гуляе?
А гуляе там сама
У белым кажусе зіма.

### На горцы

Імчацца санкі,
Смяецца Янка:
З горкі ляціць,
Аж ветрык шуміць,
Не баіцца сцюжы,
Шчокі, быццам ружы.

### Жук

Жук у поле прыляцеў,
Крыльцамі замацеў:
-Жу-жу-жу,-
гудзеў ён звонка,
у траве лічыў рамонкі.

### Скрыпач

На скрыпачцы конік іграе
І весел так напявае,
Усмешкі ён дарыць сябрам
І скача ад радасці сам.
Танцуе з тарвінкамі мак,
Аж выглянуў з хаткі слімак,
Акенца шырэй адчыняе,-
На скрыпачцы конік іграе.

### Ночка

Рассыпае ночка
Зоркі, як званочкі,
Ды звініць:
Дзінь-дон, дзінь-дон,
Да мяне прыходзіць сон
І падарыць казку ён,
Чую зорак светлы зврн:
Я хутчэй зарлюшчу вочкі,
Хай звініць званочкамі ночка.

*//Галасы: Штогоднік. 2002. Вып.1./ Уклад. Ю.Голуб.- Гродна, 2002.-167с. –(Б-ка газ. “Гродзен. праўда”)*

## Грыбы

Раз, два, тры, чатыры, пяць...
Буду я грыбы збіраць:
Вось апенькі-парасоны,
На пяньку іх восем роўна,
Маслякоў сем, як гарох,
Закаціліяся пад мох.
Шэсць ружовых сыраежак,
Быццам сонейкі ля сцежак.
Побач з лужынкай празрыстай
Пяць лісічак залацістых.
Тут схаваўся за дубок
Рыжык – сонечны грыбок.
З ім браты чатыры ранкам
Выйшлі разам на палянку,
Рыжыка ў траве шукаюць,
Зноў у хованкі гуляюць.
Тры хвалююца ваўнянкі,
Ззяюць у расе панамкі.
Выбеглі насустрач з бору
Два ў вяснушках мухаморы.
І танцуюць пад рабінай
Дзве паганкі-балярыны,
І чамусьці нават вожык
Не збірае іх у кошык?!

## Рамонкавае лета

Рамонкавае лета залатое,
З травы рамонак сонейкам глядзіць,
А сонца, нібы кветка над зямлёю,
У небе ранкам промнямі звініць.
І конік весяліцца і стракоча,
І з кветкі п’е мядовую расу,
Ён змайстраваць хутчэй арэлі хоча,
Каб на травінцы калыхаць асу.
А матылька на лузе сустракае
Рамонкаў жаўтавокіх карагод,
Як парашут, ён весела лятае
І кліча ўсіх да сонейка ў палёт.

## Спёка

На двары такая спёка,
Ходзіць качка адзінока,
Кліча пеўніка гуляць,
Каб у рэчцы панырáць.
Пеўнік узмахнуў крылом
І схаваўся пад кустом
-Лепей, качка, у цяньку
Паляжу я на баку,
У нябёсы пагляджу,
Дачакаюся дажджу.

***//Галасы: Штогоднік. 2002. Вып.2/Уклад. Ю.Голуб.-Гродна. 2003.-239с.- (Б-ка газ. “Гродз. праўда”)***

**Гром**

Загрымеў сярдзіта гром,
Паглядзеў у неба сом:
- Хто грукоча над чаротам?
- Рыбкі дрэмлюць у спякоту.

**Воўк**

Воўк па лужах едзе
На веласіпедзе.
Толькі брызгаўкі ляцяць,
Хоча зайчыка дагнаць,
Не даехаў да кустоў,
Вожык шыну пракалоў.

**Еду ў госці**

Еду ў госці да бабулі:
Там кароўка ёсць Зязюля,
Можа мыкаць шмат разоў
У рамонках ля кустоў.
Пеўнік там крычыць на плоце,
Качка плавае ў чароце,
Быццам бервяно, шчупак.
Не злавіць яго ніяк.
Нібы вуж рачулка з млынам
І духмяныя маліны,
Буду ў лесе, як мядзведзь,
У малінніку сядзець.

**Выпаў снег**

Выпаў снег у садзе ранкам,
Стала белаю палянка,
І сцяжынка пабялела,
Клён стаіць у хустцы белай,
На вачах ва ўсіх пад клёнам
Ходзіць белая варона.



*//Галасы: Штогоднік. 2002. Вып.2/Уклад. Ю.Голуб.-Гродна. 2003.-239с.- (Б-ка газ. "Гродз. праўда")*

***Таццяна Сучкова***

**НОЧКА**

Рассыпае ночка
Зоркі, як званочкі,
Ды звініць:
Дзінь-дон, дзінь-дон,
Да мяне прыходзіць сон.
І падарыць казку ён,
Чую зорак светлы звон:
Я хутчэй заплюшчу вочкі,
Хай звініць званочкам ночка.

**РАКА І РУЧАЁК**

Па травінках скок-паскок –
Бег празрысты ручаёк.
І скакаў ён па пяску:
Ручаёк шукаў раку.
А рака за сінім борам
Дзень і ноч шукала мора.

**ШТО З САБАЧКАМ?**

Здарылася што з сабачкам?
За мячом Барбос не скача,
З кошкай Мусяй не гуляе
І мяне не сустракае,
А падкурчыў хвост пад лапкі –
Ён падраў у мамы тапкі.

**СІНІ ДЗЯНЁК**

Ад сініх кветак сіні дзянёк,
Сіні, як неба, стаіць васілёк,
І сінія птушкі над сіняй гарой,
А неба, як хустка, над сіняй ракой.



**ЖАЎРУК**

Жаўрук у хмарках серабрыстых
Спяваў над полем галасіста,
А гусі крыламі махалі –
І хмаркі над зямлёй расталі.

**ВЯСНА**

Вясна-прыгажуня блакітнай хусцінкай
Махала бярозкам, махала рабінкам,
І першыя кветкі яна вышывала,
Зялёнаю фарбай траву малявала.
І кветкі звінелі, спявалі травінкі,
У полі вясна зеляніла сцяжынкі,
Каб сонейка бегла да жыта па сцежках
І кожнай расліне дарыла б усмешку.

**СОНЕЧНЫ ДЗЯНЁК**

Заліты сонейкам дзянёк,
У промнях сонечных дубок.
Між дрэў сцяжынка залатая
І золатам рачулказзяе.
А зайчык сонечны, як мячык,
Так весела па кветках скача.
У промнях залацісты ўзгорак,
Лье сонца бліскаўкі над борам
І соснам лапкі залаціць,
І быццам залатая ніць,
Абвіла елку павуцінка,
У промнях сонечных травінка
Купаецца і зіхаціць.
А гай бярозавы звініць,
І нібы ружамі, пянёк
Расцвёў у сонечны дзянёк.

***//Нябесны знак:Літаратурна-мастацкі альманах. 2003***
***/Рэд. М.Шаўчонак.-ГАУПП “Слонімская друкарня”, 2003.-128 с.***

**ЗА АКЕНЦАМІ**

За акенцам вечар сіні,
З сініх елак сыпле іней.
На заснежанай палянцы
Дуб у зоркавай панамцы.

**ВЫПАЎ СНЕГ**

Выпаў снег у садзе ранкам,
Стала белаю палянка,
І сцяжынка пабялела,
Клён стаіць у хустцы белай.
На вачах ва ўсіх пад клёнам
Ходзіць белая варона.

**ЗІМА**

Гурба снегу ў садзе белым,
А на гурбу сонца села.
Снег лятае серабрысты,
Зіхаціць у полі чыстым,
І сняжынкі над зямлёй
Скачуць весела гурбой.
Белы вецер пад рабінкай
Сцеле белую пярынку,
Зоркі ў полі рассыпае...
Па сцяжынках хто гуляе?
А гуляе так сама
У белым кажусе зіма.



**СКРЫПАЧ**

На скрыпачцы конік іграе
І весела так напявае,
Усмешкі ён дарыць сябрам
І скача ад радасці сам.
Танцуе з травінкамі мак,
Аж выглянуў з хаткі слімак,
Акенца шырэй адчыняе, -
На скрыпачцы конік іграе.

**У БАРЫ**

Вялікі зубр ля сосен ходзіць,
Ён з зубраняці воч не зводзіць.
Падкінуў сонейка рагамі
Над ружаватымі кустамі...
А бусел узмахнуў крылом:
-Вось гэта дзіва, быццам сон! –
Усе пачулі крылаў звон.
І здзіўлена глядзяць бабры,
Як побач ходзяць дзве гары:
Вялікі зубр ды зубраня. –
Вакол такая цішыня.

*//Нябесны знак:Літаратурна-мастацкі альманах. 2003*
*/Рэд. М.Шаўчонак.-ГАУПП “Слонімская друкарня”, 2003.-128 с.*